# УСПАМІНЫ, ДЗЁННІКІ і ДАКУМЕНТЫ

## С. ПРЫТЫЦКІ

★

## У ІМЯ ШЧАСЦЯ ПРАЦОЎНАГА НАРОДА

1 студзеня 1959 года беларускі народ разам з народамі другіх рэспублік Савецкага Саюза будзе святкаваць саракавую гадавіну стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

У верасні 1959 года споўніцца дваццаць гадоў з дня ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай дзяржаве.

У гэтыя дні нельга не ўспомніць пра цяжкое жыццё і дваццацігадовую барацьбу працоўных заходніх абласцей Беларусі супраць капіталістаў і памешчыкаў за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за Савецкую ўладу.

Дваццаць гадоў у жыцці народаў — гэта невялікі перыяд. Аднак дваццаць гадоў акупацыі Заходняй Беларусі белапалякамі астануцца для працоўных гэтых абласцей на шмат вякоў у памяці як гады жорсткага сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, гераічнай і самаахвярнай барацьбы.

У той час як у Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі будаваўся сацыялізм, працоўныя Заходняй Беларусі былі асуджаны польскімі панамі на паўгалоднае існаванне і паступовае выміранне.

Пры фашысцкім рэжыме Пілсудскага і яго паследкаў: славой-складкоўскіх, рыдз-смігльіх і бекаў — нялёгка жылося польскаму рабочаму класу і працоўнаму сялянству, але працоўным Заходняй Беларусі жылося яшчэ горш.

Польскія магнаты, як толькі дабраліся да ўлады, адразу ж падзялілі Польшчу на дзве часткі: на Польшчу «А» (цэнтральная Польшча) і Польшчу «Б», ці так званыя «Крэсы ўсходнія» (усходнія ўскраіны). Каб утрымацца ва ўладзе, польскія капіталісты і памешчыкі, беручы прыклад з эксплуататараў іншых дзяржаў, якія мелі калоніі, спрабавалі ўлагоджваць свой пралетарыят і дробную буржуазію, крыху падкормліваючы іх за кошт ускраін.

Цэнтральная Польшча мела якую-ні-якую буйную прамысловасць, ва ўсходніх жа раёнах яе бадай што не было. Зарплата рабочых у цэнтральных раёнах Польшчы была ў два разы вышэй, чым у Заходняй Беларусі. Там інтэнсіўней вялася сельская гаспадарка, не такі жорсткі быў паліцэйскі рэжым. Польшчу «Б», г. зн. усходнія ўскраіны, акупанты разглядалі як сваю калонію і па-драпежніцку эксплуатавалі яе прыродныя багацці і танную, амаль бясплатную рабочую сілу.

За час панавання польскіх акупантаў прамысловая вытворчасць у Заходняй Беларусі ў параўнанні з 1913 годам скарацілася на 40 працэнтаў. Сярэдняя зарплата рабочага тут была 15 злотых у тыдзень, працоўны дзень цягнуўся 10—12 і больш гадзін. Праца сельскіх рабочых, жанчын і дзяцей аплачвалася яшчэ ніжэй. Але і гэткага мізэрнага заробку не мела велізарная маса працоўных. Паводле афіцыйных звестак польскай статыстыкі, толькі ў га-

---

Успаміны гэтыя напісаны аўтарам для зборніка, падрыхтаванага да выдання Інстытутам гісторыі партыі.

радах Польшчы ў 1939 годзе налічвалася 1,5 мільёна беспрацоўных. Калі ж улічыць беспрацоўных у вёсцы, якіх ніхто не рэгістраваў, і напоўбеспрацоўных, дык гэтая лічба перавышала 3 мільёны чалавек.

Сялянства Заходняй Беларусі задыхалася ад зямельнага голаду. 16 тысяч польскіх памешчыкаў, што складалі ўсяго толькі 0,9 працэнта насельніцтва, валодалі большай паловай зямлі. Зямля належала такім магнатам, як Радзівілы, Сапегі, Чартарыскія, і інш. Значная частка лепшай зямлі была таксама ў руках каталіцкай царквы, кулакоў і асаднікаў.

Сотні тысяч беззямельных і малазямельных сялян Заходняй Беларусі вымушаны былі хадзіць з торбай за плячыма ад горада да горада, шукаючы працы і кавалка хлеба. Але гарады былі перапоўнены беспрацоўнымі. Тады, ратуючыся ад галечы, тысячы сялян пакідалі свае сем'і, родныя мясціны і выязджалі ў ЗША, Францыю, Германію і іншыя краіны. Але і там іх чакалі лёс беспрацоўных або жорсткая эксплуатацыя.

Тагачасная Польшча была слаба развітай у эканамічных адносінах краінай. Нацыянальны даход яе быў нязначны. На ўтрыманне дзяржаўнага апарата, судоў, турмаў, паліцыі, дэфензівы патрабаваліся велізарныя сродкі. Апроч таго, шмат сродкаў ішло на выплату даўгоў краінам Антанты, і перш за ўсё Францыі, а таксама на падрыхтоўку вайны супраць СССР.

Усе гэтыя сродкі польскі ўрад выцягваў з працоўных, неміласэрна іх эксплуатуючы. Чаго толькі ён ні прыдумваў, каб высмактаць з рабочых і сялян астатнія сокі.

Апроч таго, што была нізкая заработная плата, штучна ствараліся высокія манапольныя цэны на прамысловыя тавары і прадметы першай неабходнасці (соль, цукар, тытунь, запалкі і інш.) і нізкія цэны — на сельскагаспадарчыя прадукты.

У той час як адзін пуд хлеба каштаваў 2,5 — 3 злотыя, а дзесятак яек 10 грошаў, васьмушка махоркі каштавала 70 грошаў, карабок запалак — 10 грошаў. За адзін пуд хлеба селянін мог купіць тры-чатыры васьмушкі махоркі, а за дзесятак яек толькі адзін карабок запалак.

Працоўных душылі шматлікімі падаткамі. Яшчэ больш было ўсялякіх штрафаў. Сяляне былі пастаўлены ў такія ўмовы, што літаральна нельга было зрабіць і адзін крок, каб не плаціць штрафу. Плот не пафарбаваны — штраф (5 злотых), комін не пабелены — штраф, едзеш па дарозе не па тым боку, як указана, — штраф, конь не закілзаны — штраф, на калёсах няма таблічкі з дакладным адрасам гаспадара — штраф, пад калёсамі няма вядра на калёсную мазь — штраф, назбіраў бярэма гнілога ламачча ў памешчыцкім ці дзяржаўным лесе (а іншых лясоў не было) — штраф, сарваў грыб ці ягаду — штраф, маеш запальнічку без кляйма — штраф, карыстаешся крэсівам — штраф, раскалоў запалку на чатыры часткі — штраф.

За самавольную пасадку тытуню каралі не толькі штрафам, але і турэмным зняволеннем. За адно пасаджанае каліва тытуню без суда і следства давалі адзін месяц турмы, за 12 — год, за 24 — два гады, і г. д.

Масавае беспрацоўе, зямельны голад, бесчалавечная эксплуатацыя, непамерныя падаткі і штрафы давводзілі працоўных Заходняй Беларусі да крайняй беднасці, чаго не ўтойвалі нават афіцыйная польская прэса і ўрад.

Людзі старэйшага пакалення памятаюць, як яны апрацоўвалі памешчыцкую зямлю за трэці сноп і елі хлеб напалову з мякінай і бульбай, як ім даводзілася месяцамі жыць без солі, запалку дзяліць на чатыры часткі, васьмушку махоркі купляць на чатырох чалавек, вечарамі сядзець за лучынай, хадзіць у саматканай зрэбнай сярмязе і насіць абутак на драўлянай падэшве.

Асабліва бязрадаснае было жыццё дзяцей і моладзі. Цяжкія жыллёвыя ўмовы, нястача сродкаў, каб набыць адзежу і абутак, сістэматычнае недаяданне — усё гэта выклікала частыя захворванні і эпідэміі, якія забіралі тысячы юных жыццяў. Тых, хто аставаўся жыць, чакала адна доля — быць цёмным і бяспраўным нявольнікам капіталістаў і памешчыкаў.

Нашым савецкім юнакам і дзяўчатам бывае дзіўна і не заўсёды зразумела, калі яны чуюць, што ў капіталістычных краінах для дзяцей працоўных зачынены дзверы ў школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы.

А яны зачыняюцца вельмі проста. Так, напрыклад, у былой Польшчы навучанне ў гімназіі каштавала 900 злотых у год, а карова каштавала 250—300 злотых, пуд жыта — 2,5—3 злотыя. Значыцца, селяніну, каб паслаць свайго сына ці дачку ў гімназію, трэба было прадаць 2—3 каровы або 300 пудоў жыта. Вядома, што ён пры ўсім жаданні не мог гэтага зрабіць. Вось чаму большасць насельніцтва ў панскай Польшчы была непісьменная.

Працоўныя Заходняй Беларусі пакутавалі не толькі ад цяжкога сацыяльнага ўціску, але і ад жорсткага нацыянальнага прыгнечання. Польскія акупанты ўсяляк імкнуліся пазбавіць беларускі народ яго нацыянальнай самасвядомасці. Яны даказвалі, што беларускай нацыянальнасці ніколі не было і няма.

Школы, кнігі, газеты на беларускай мове, за выключэннем некалькіх брудных лісткоў, што выдаваліся беларускімі нацыяналістамі Астроўскім і Луцкевічам, былі забаронены. У дзяржаўных установах беларусам не дазвалялася размаўляць на роднай мове.

У кожным беларусе прадстаўнікі польскага ўраду бачылі бальшавіка, «выўратоўца» (бунтаўшчыка). Таму беларусам не дазвалялася займаць якія-небудзь пасады ў арміі, працаваць у дзяржаўных установах і на некаторых прадпрыемствах. З дапамогай усялякіх фашысцкіх і нацыяналістычных арганізацый (якіх было многа), ксяндзоў, памешчыкаў, чыноўнікаў, настаўнікаў і асаднікаў вялася ўзмоцненая паланізацыя заходнебеларускага насельніцтва і шалёная кампанія супраць Савецкага Саюза, распальвалася нацыянальная варожасць. Усё гэта суправаджалася зневажаннем і прыніжэннем не толькі нацыянальнай, але і чалавечай годнасці.

Цяжкой эксплуатацыяй, крывавым тэрорам і ідэалагічным уздзеяннем польскія акупанты спрабавалі ператварыць працоўных Заходняй Беларусі ў паслухмяных нявольнікаў, рабочую жывёлу. У адносінах да беларусаў у іх не было іншага слова, як «быдла».

Беларускі народ ні на адну хвіліну не схіляў сваю галаву перад яснавяльможнымі панамі. Ён не толькі пакутаваў, але і змагаўся. Ні турмы, ні катаванні, ні палявыя суды і шыбеніцы не змаглі зламаць яго непахісную волю да барацьбы за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Беларускі народ змагаўся і верыў у перамогу таму, што яго падтрымлівалі рабочы клас і бяднейшае сялянства Польшчы, што яго барацьбе спачувалі пралетарыі ўсіх краін. Шлях да перамогі беларускаму народу асвятляў вялікі Савецкі Саюз, дзе працоўныя жылі без памешчыкаў і капіталістаў і паспяхова будавалі сацыялізм.

Натхніцелем і арганізатарам барацьбы беларускага народа была Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Камуністычнай партыі Польшчы. З часу свайго стварэння (канец 1923 г.) і да 1938 года ўключна КПЗБ у цяжкіх умовах падполля, тэрору, нацкоўвання і правакацый была адзіным выразнікам дум і спадзяванняў шырокіх мас працоўных Заходняй Беларусі, кіраўніком іх рэвалюцыйнай барацьбы.

Асноўным і галоўным памочнікам партыі быў камсамол (створаны ў 1924 г.), які пад яе кіраўніцтвам вёў вялікую арганізатарскую і палітычную работу сярод моладзі, узнімаў яе на барацьбу.

Надзвычай шмат партыі і камсамолу дапамагалі МОПР і вялікая армія часта непрыкметных, але самаахвярных і не менш адданых справе рэвалюцыі, чым члены партыі, сімпатыкаў (спачуваючых). Сімпатыкі хавалі ў сябе і кармілі падпольшчыкаў, былі ў іх за праваднікоў і не аднойчы, ахвяруючы сабою, выратоўвалі жыццё рэвалюцыянерам. Толькі дзякуючы ім КПЗБ, нягледзячы на тэрор, магла існаваць і дзейнічаць.

Камуністычная партыя Польшчы і яе састаўная частка КПЗБ у сваёй дзейнасці дапускалі нямала памылак. Аднак яны прарабілі велізарную работу ў справе выхавання не толькі членаў партыі, але і шырокіх мас працоўных у духу пралетарскага інтэрнацыяналізма і братняй салідарнасці. Вось чаму кожнае выступленне рабочых у Варшаве, Лодзі, Кракаве заўсёды сустракала гарачую падтрымку з боку працоўных Заходняй Беларусі. І наадварот, выступленні сялян, рабочых прамысловых прадпрыемстваў і лясных промыслаў у

Заходняй Беларусі знаходзілі падтрымку польскага пралетарыята.

У Заходняй Беларусі амаль што не было буйных мястэчак або вёсак, дзе не існавала б падпольнай партыйнай ці камсамольскай ячэйкі, а іх уплыў адчуваўся ўсюды. Асабліва моцна быў развіты рэвалюцыйны рух у Гродзенскім, Брэсцкім, Кобрынскім, Пружанскім, Пінскім, Слонімскім, Баранавіцкім, Навагрудскім і Косаўскім паветах.

У 1939 годзе, у час вызвалення Заходняй Беларусі, у гродзенскай дэфензіве была знойдзена карта населеных пунктаў, «паражоных бальшавіцкай прапагандай», складзеная, трэба сказаць, не без ведання справы. На гэтай карце ледзь не ўсе вёскі былі абведзены чырвоным алоўкам.

Кампартыя і камсамол Заходняй Беларусі вялі гераічную барацьбу супраць польскіх акупантаў, супраць сацыяльнага і нацыянальнага заняволення працоўных. Яны выступалі за павышэнне заработнай платы рабочым і ўвядзенне васьмігадзіннага рабочага дня, супраць эксплуатацыі дзяцей і жанчын. Пад іх лозунгамі неаднойчы праходзілі стачкі і дэманстрацыі рабочых у гарадах, лясных і сезонных рабочых — у вёсках. Гэтыя стачкі і дэманстрацыі часта перарасталі ў адкрытыя выступленні супраць фашысцкага ладу, вызначаліся цвёрдасцю, арганізаванасцю і класавай салідарнасцю. Вось адзін са шматлікіх прыкладаў.

Вясною 1933 года па ініцыятыве камуністаў пачалася забастоўка тэкстыльшчыкаў у Беластоку, якая прадаўжалася больш за тры месяцы.

У ходзе забастоўкі рабочыя наладжвалі дэманстрацыі, у час якіх адбываліся сутычкі з паліцыяй. У сярэдзіне мая бастуючыя рабочыя Беластока і Васількова, больш за тысячу чалавек, накіраваліся ў мястэчка Супрасль, за 18 кіламетраў ад Беластока, каб спыніць работу супрасльскіх тэкстыльшчыкаў. Ім запыніла дарогу паліцыя, аднак бастуючым удалося пранікнуць на фабрыку і пераканаць рабочых далучыцца да ўсеагульнай забастоўкі.

Для падтрымкі бастуючых тэкстыльшчыкаў у Беластоку было праведзена тры забастоўкі ўсіх рабочых горада і бліжэйшых фабрык.

Рабочыя Варшавы, Лодзі і іншых гарадоў выносілі рэзалюцыі пратэсту, збіралі грошы на дапамогу стачачнікам і пасылалі ім пісьмы з заклікамі змагацца да перамогі.

Становішча бастуючых тэкстыльшчыкаў, якія не мелі сродкаў на існаванне, з кожным днём пагаршалася. Тады на дапамогу ім пад кіраўніцтвам камуністаў і камсамольцаў прыйшлі сяляне Беластоцкага і Гродзенскага паветаў. Камуністы, камсамольцы і спачуваючыя на фурманках з чырвонымі стужкамі на дугах аб'язджалі вёскі і збіралі прадукты бастуючым тэкстыльшчыкам. Хвалюючае было відовішча, калі шмат якія сяляне са слязмі спагады на вачах выносілі апошні пуд жыта і аддавалі яго, каб памагчы сваім братам рабочым.

Зімою 1933 — 1934 гг. пачалася стачка рабочых лясных промыслаў Саколкаўскага і Гродзенскага паветаў, а потым перакінулася на Слонімшчыну. У ёй удзельнічала некалькі тысяч чалавек.

На падаўленне стачкі лясных рабочых урад кінуў атрады паліцэйскіх, а ў якасці штрэйкбрэхераў — «стральцоў» і кулакоў, якім плаціў вялікія грошы. У адказ на гэта рабочыя, узброіўшыся сякерамі і каламі, арганізавалі пікеты па 100 — 150 чалавек, аб'язджалі дзялянкі і выганялі з лесу штрэйкбрэхераў і іхнюю ахову — паліцыю.

Каб заглушыць забастоўку, паліцыя ў снежані 1933 года арыштавала стачачны камітэт лясных рабочых і адправіла яго ў паліцэйскі ўчастак у вёсцы Шудзялава Саколкаўскага павета. Даведаўшыся пра гэта, бастуючыя ў колькасці больш за 600 чалавек з чырвонымі сцягамі накіраваліся да вёскі Шудзялава, каб вызваліць арыштаваных таварышаў.

Каля паліцэйскага ўчастка сабралася некалькі соцень лясных рабочых. Яны патрабавалі вызвалення арыштаваных. Падаспела паліцыя і адкрыла па рабочых агонь. Пры гэтым камендант паліцыі забіў аднаго з актыўных арганізатараў стачкі лясных рабочых — камуніста Хомчыка. Дзесяткі рабочых былі паранены. Скарыстаўшы замяшанне, паліцыя вывезла арыштаваных членаў стачачнага камітэта ў Саколку, а дэманстрацыю разагнала.

У студзені 1934 года такая ж расправа была ўчынена над ляснымі рабочымі ў вёсцы Жыровічы Слонімскага павета.

Каб задушыць рэвалюцыйны рух, урад арганізаваў так званую «пацыфікацыю» (уціхамірвальную экспедыцыю). У вёсках Залессе, Загор'е, Сучкі, Баравікі, Капусты, Акунінава, Русакова Слонімскага павета і іншых банды паліцэйскіх і сышчыкаў урываліся ў хаты, арыштоўвалі жыхароў і па-зверску іх збівалі. Яны таксама здзіралі стрэхі з хат, разбівалі вокны, дзверы, печы, перакульвалі кадушкі з капустай, высыпалі з мяшкоў жыта, крупы, муку, і ўсё гэта аблівалі газай.

Жудаснае відовішча ўяўлялі сабой гэтыя пацыфікацыі. Далёка навакол вёсак чуўся плач жанчын і дзяцей, брэх сабак і рыканне някормленых кароў, злосныя выкрыкі і адборная лаянка паліцэйскіх.

Апроч пацыфікацый польскія акупанты шырока практыкавалі стварэнне «пастарункаў карных» (карных паліцэйскіх участкаў). Гэта рабілася такім чынам. У вёску, дзе, як меркавала ахранка, быў развіты рэвалюцыйны рух і існавала падпольная партыйная арганізацыя, прыязджалі ад 50 да 100 паліцэйскіх і размяшчаліся па хатах на 1—2 месяцы. У вёсцы абвяшчалі асаднае становішча. Сялянам забаранялі выходзіць з хат, ніхто не меў права выходзіць з вёскі і заходзіць у яе, а хто парушаў гэтае распараджэнне, у таго стралялі без папярэджання.

Ніколі не забуду тое, што мне давялося бачыць у сакавіку 1934 года ў вёсцы Какошчыцы Слонімскага павета, дзе я хаваўся ад праследавання паліцыі. У той час там дзейнічаў карны атрад. Паліцыя арыштавала мужчын і жанчын. Загналі іх у будынак школы і да страты прытомнасці збілі гумавымі палкамі. Карнікі асабліва здзекаваліся з моладзі. Дзяўчат падвешвалі за косы да столі, трымалі ў такім становішчы па некалькі гадзін, білі іх, патрабуючы, каб выдалі камуністаў і камсамольцаў.

Аднак ні катаванні, ні пацыфікацыі не маглі прымусіць лясных рабочых выйсці на працу. Беластоцкія тэкстыльшчыкі баставалі больш за 3 месяцы, лясныя рабочыя — 4 месяцы. Абедзве стачкі закончыліся перамогай рабочых. Патрабаванні бастуючых былі задаволены. У гэтых стачках тэкстыльшчыкі і лясныя рабочыя праявілі выключную стойкасць, класавую свядомасць і братэрскую салідарнасць.

Сялянскія рэвалюцыйныя выступленні ў Заходняй Беларусі таксама мелі шырокі і баявы характар. Часта яны былі накіраваны супраць цяжкіх падаткаў і дарожнай павіннасці («шарваркаў»), праходзілі пад лозунгам Кампартыі і камсамола: «Ніводнага гроша падаткаў фашысцкаму ўраду — ураду голаду, вайны і тэрору!» Пры гэтым шмат у якіх выпадках справа даходзіла да крывавых сутычак паміж сялянамі і паліцыяй.

Улетку 1932 года, напрыклад, у вёску Кавалі Гродзенскага павета заявіліся паліцэйскія «секвестратары» забіраць маёмасць у сялян за нявыплату падаткаў. У той дзень, калі прыехалі паліцэйскія, у вёсцы былі толькі дзяды, жанчыны і малыя дзеці, астатнія ўсе працавалі ў полі на ўборцы ўраджаю. Калі паліцэйскія пачалі выносіць з хат усё, што мела якую-небудзь каштоўнасць, і грузіць на падводы, піянеры (у нас былі і піянерскія падпольныя арганізацыі), каб склікаць людзей, пачалі крычаць: «Пажар!». Некалькі з іх конна памчалі ў поле. Сяляне прыбеглі ў вёску, каменнямі і каламі прагналі паліцэйскіх, адабраўшы ў іх нарабаваную маёмасць.

Увосень 1933 года гэткая ж сутычка была ў вёсцы Слойя, а ў 1934 годзе і ў маёй роднай вёсцы Гаркавічы Саколкаўскага павета. У Слойі шмат якім паліцэйскім каменнямі паразбівалі галовы, секвестратару пераламалі ногі. Пасля гэтага ў вёску прыехала карная экспедыцыя і арыштавала 60 чалавек моладзі. Некалькі сутак па-зверску катавалі іх, патрабуючы, каб выдалі камуністаў і камсамольцаў, але дарэмна: моладзь мужна цярпела катаванні і маўчала. Тады супраць іх сфабрыкавалі судовы працэс. 28 чалавек было прыгаворана да турэмнага зняволення на тэрміны ад 3 да 15 гадоў. Аднак прымусіць сялян плаціць падаткі фашыстам не ўдалося.

Прыклад вёскі Слойя адразу ж стаў вядомы ва ўсёй Заходняй Беларусі. Ён натхняў сялян іншых вёсак

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы